ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*

***HISTORY***

УДК [327.58:323.1](476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-299-311

Паступіў у рэдакцыю 13.03.2019
Received 13.03.2019

**Д. А. Крывашэй**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА Ў КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫЦЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (1990–2017 гг.)

**Аннотация.** Представлены основные результаты историко-системного анализа особенностей становления и развития такого направления культурной политики в Республике Беларусь, как связи с диаспорой. Определены этапы развития, основные субъекты и направления сотрудничества метрополии с диаспорой. На первом этапе (1990–1995 гг.) значительно активизировались связи, увеличилось количество субъектов, которые занимались их налаживанием и реализацией. Для системной работы был создан Координационный совет по делам белорусской диаспоры, разработана и принята программа "Белорусы в мире". В 1996–2007 гг. на развитие контактов с диаспорой оказали существенное влияние политические события в Беларуси и недостаточность финансовых средств. В условиях разделения белорусской диаспоры по политическим взглядам важную роль начали играть дипломатические представительства. Вопросы сотрудничества с диаспорой вошли в компетенцию созданного в 1997 г. Государственного комитета по делам религий и национальностей. С 2008 г. наблюдались существенные перемены в сотрудничестве белорусского государства с диаспорой. Органы государственной власти активно участвовали в реализации инициатив, высказанных участниками V съезда, белорусов мира (2009 г.). Главным субъектом политики относительно белорусов зарубежья являлось Министерство культуры. В структуре Института культуры Беларуси стал действовать отдел по вопросам белорусской диаспоры. С принятием Государственной программы "Белорусы в мире" на 2013–2015 гг. начался новый этап. После доработки в 2014 г. был принят Закон "О белорусах зарубежья". Вопросы сотрудничества с диаспорой вошли в Кодекс о культуре (2016). Культурное сотрудничество с диаспорой стало более разнообразным.

**Ключевые слова**: диаспора, культурная политика, общественные объединения, государственная программа, соотечественники за границей

**Для цитирования.** Крывашэй, Д. А. Беларуская дыяспара ў культурнай палітыцы Рэспублікі Беларусь (1990–2017 гг.) / Д. А. Крывашэй // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 3. – С. 299–311. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-299-311

**D. A. Kryvashei**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

# BELARUSIAN DIASPORA IN CULTURAL POLICY OF THE REPUBLIC OF BELARUS (1990–2017)

**Abstract.** The analysis of establishment and development of relations of Belarus with its countrymen abroad as a part of the government culture policy is given in the article. The author defines the development stages, main subjects, and the directions for cooperation of metropolis with diaspora. During the first stage (1990–1995) the relations intensified significantly, the number of subjects that were involved in building bridges and implementing connections increased. Coordinating council for the Belarusian community living abroad was established, programme «Belarusians in the world» was created and implemented for systematic work. From 1996 to 2007 political events and financial stringency had impact on the connections development. An important role was played by diplomatic missions under the circumstances of Belarusian diaspora division based on political opinions. Questions regarding cooperation with the diaspora were then on the agenda of the State committee on religion and nationality, which was seen in cooperation between Belarusian government and the diaspora since 2008. National authorities played an active role in realization of initiatives expressed by the participants at the 5th Congress of Belarusians of the world (2009). The main subject of the policy regarding Belarusians abroad was the ministry of culture. Belarusian diaspora department began to work as a part of Belarusian institute of culture. A new stage started with signing

© Крывашэй Д. А., 2019

a government program «Belarusians in the world» for 2013–2015. A new law «Relating to Belarusians abroad» was made in 2014. Issues regarding cooperation with the diaspora were included in the Code on culture (2016). Cultural cooperation with the diaspora became more diverse.

**Keywords:** diaspora, cultural policy, voluntary associations, government program, compatriots abroad

**For citation.** Kryvashei D.A. Belarusian diaspora in cultural policy of the Republic of Belarus (1990–2017). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 3, pp. 299–311 (in Belarusian). https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2019-64-3-299-311

**Уводзіны.** Важным напрамкам міждзяржаўных адносін з'яўляецца ўмацаванне сувязей з беларусамі замежжа. Сёння беларуская дыяспара разглядаецца як важны нацыянальны, інтэлектуальны, сацыяльна-культурны, дэмаграфічны і эканамічны рэсурс Рэспублікі Беларусь, які можа стаць істотным фактарам ажыццяўлення беларускай знешняй і ўнутранай палітыкі, развіцця гандлёва-эканамічных і культурных сувязей з замежнымі краінамі ў інтарэсах Рэспублікі Беларусь, павышэння міжнароднага іміджу беларускай дзяржавы.

На сённяшні момант існуе шэраг навуковых даследаванняў, у якіх разгледжаны разнастайныя пытанні гісторыі і сучаснага стану як беларускай дыяспары ў цэлым, так і ў асобных краінах. Гэта работы Г. Сяргеевай, У. Снапкоўскага, С. Шабельцава, Н. Гардзіенкі, В. Коваль і інш. У той жа час толькі адзінкавыя працы прысвечаны вывучэнню пытання месца дыяспары ў знешняй палітыцы Беларусі (А. Ціхаміраў, В. Шадурскі), дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь адносна беларускай дыяспары (Т. Шупенька, С. Самкова).

У дадзеным артыкуле прадстаўлены асноўныя вынікі гісторыка-сістэмнага аналізу асаблівасцей станаўлення і развіцця такога напрамку культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, як сувязі з дыяспарай. На падставе вывучэння нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, архіўных дакуметаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей, інфармацыі перыядычнага друку і афіцыйных інтэрнэт-старонак дзяржаўных і грамадскіх структур былі вызначаны этапы развіцця, асноўныя суб'екты і напрамкі супрацоўніцтва метраполіі з дыяспарай.

**Асноўная частка.** Праца з дыяспарай была адным з напрамкаў знешняй палітыкі БССР. У 1960–1964 гг. дзейнічала Беларуская секцыя камітэта «За вяртанне на Радзіму і развіццё культурных сувязей з суайчыннікамі». У 1964 г. было створана асобнае Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (Таварыства "Радзіма"). З яго дапамогай аказвалася разнастайная падтрымка дзейнасці аб'яднанняў землякоў за мяжой. З 1955 г. выдавалася газета "Голас Радзімы".

З развіццём працэсаў дэмакратызацыі і нацыянальна-культурнага адраджэння адчувальным стаў рост узаемнай зацікаўленасці ў наладжванні больш цеснага супрацоўніцтва паміж суполкамі дыяспары і метраполіяй. Пашыралася кола грамадскіх арганізацый, якія наладзілі кантакты з арганізацыямі беларусаў замежжа. У верасні 1990 г. каля 60 прадстаўнікоў рэспублікі прынялі ўдзел у 19-й сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі [1, с. 335]. У верасні 1990 г. з мэтай «спрыяць нацыянальнаму адраджэнню Беларусі, яе мовы, культуры, духоўнасці і маралі, гістарычнай памяці, аднаўленню дзяржаўнасці» [2] было створана Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" (ЗБС "Бацькаўшчына").

Садзейнічанне нацыянальна-культурнаму развіццю беларускай дыяспары было прадугледжана *Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах" (1990 г.)* (арт. 34) [3]. У іншых заканадаўчых актах, якія закраналі пытанні сферы культуры, праблема захавання і развіцця культуры беларускай дыяспары не акрэслівалася да 2016 г.

У красавіку 1992 г. была прынята асобная пастанова Урада, накіраваная на актывізацыю і паляпшэнне дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына". Міністэрства культуры павінна было дапамагчы стварэнню культурнага цэнтра ў г. Мінску для забеспячэння духоўных патрэб беларускай дыяспары, Мінскі гарвыканкам – выдзеліць памяшканне для размяшчэння такога цэнтра і кіраўнічых органаў аб'яднання. Міністэрствам замежных спраў, культуры, адукацыі, іншым міністэрствам і ведамствам Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму прадпісвалася аказваць "Бацькаўшчыне" пастаяннае садзейнічанне і канкрэтную дапамогу ў рэалізацыі яе гуманістычных задач і мэт [4]. У 1993 г. ЗБС атрымала памяшканне ў гістарычным будынку,

у якім у 1920-я гг. размяшчаўся Інбелкульт (вул. Рэвалюцыйная, 15). З гэтай пары набыло сістэмны характар збіранне бібліятэкі, уладкаванне архіва і прадметаў культурнай спадчыны дыяспары.

19–20 снежня 1992 г. у Мінску адбыўся Сход беларусаў блізкага замежжа, у якім больш за 200 дэлегатаў прадстаўлялі каля 2 мільёнаў нашых суайчыннікаў з тэрыторыі былога СССР і Польшчы (Беласточчыны). З мэтай аб'яднання беларусаў свету і арганізацыйнага афармлення сусветнай беларускай супольнасці як новай грамадскай структуры на карысць нацыянальнага адраджэння і будаўніцтва самастойнай беларускай дзяржавы ў ліпені 1993 г. у Мінску прайшоў Першы з'езд беларусаў свету. На ім прысутнічала больш за 1200 удзельнікаў, з іх прадстаўнікоў замежжа – 486 чалавек [5]. У далейшым такія форумы праходзілі кожныя чатыры гады.

6–7 жніўня 1994 г. Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына" і віленскімі беларускімі суполкамі пры ўдзеле Пасольства Беларусі ў Літве ў Вільнюсе быў праведзены Першы з'езд беларусаў краін Балтыі [6].

У 1993 г. асобнай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана праграма *"Беларусы ў свеце"* (дзейнічала да 1999 г.). Спецыяльная пастанова Савета Міністраў, якая зацвярджала Праграму, прадугледжвала і меры па яе выкананню [7]. Сярод іх: стварэнне на грамадскіх пачатках пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь *Каардынацыйнай рады па справах беларускай дыяспары.* Яе старшынёю быў прызначаны намеснік старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму было прапанавана распрацаваць рэгіянальныя праграмы супрацоўніцтва з беларускім замежжам.

**Міністэрства замежных спраў** атрымала даручэнне аказваць метадычную і практычную дапамогу таварыствам беларускай культуры за мяжой у іх культурна-асветніцкай дзейнасці, а таксама садзейнічаць правядзенню мерапрыемстваў па ўзмацненню кантактаў з беларускай дыяспарай. У дзяржаўным бюджэце 1994 г. прадугледжвалася мэтавае фінансаванне праграмы "Беларусы ў свеце".

Сама Праграма складалася з трох раздзелаў: сацыяльная і прававая абарона беларусаў замежжа; развіццё сувязей Рэспублікі Беларусь з беларускай дыяспарай; эканамічная і навукова-тэхнічная дзейнасць. Сярод разнастайных мерапрыемстваў быў намер адкрыць у Мінску Усебеларускі дом з навуковым аддзелам "Беларусы ў свеце", адпаведнай музейнай экспазіцыяй, банкам інфармацыі, бібліятэкай, архівам аудыёвідэаматэрыялаў, рукапісаў даследчыкаў беларускай дыяспары і нашых замежных суайчыннікаў.

Праграмай быў прадугледжаны прыём па рэкамендацыях кіраўніцтва беларускіх суполак з іншых краін маладых суайчыннікаў на вучобу ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі з выдзяленнем для іх пэўнай колькасці дзяржаўных стыпендый, а таксама забеспячэнне стыпендыямі студэнтаў – грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія паступілі на вучобу ў іншыя краіны.

Асобны блок уключаў шэраг захадаў па знаёмству грамадскасці Беларусі з культурна-мастацкай спадчынай яе суайчыннікаў за мяжою. Гэта выданне ў рэспубліцы мастацкіх і навуковых твораў прадстаўнікоў беларускага замежжа, энцыклапедычнага даведніка "Беларусь у свеце"; папаўненне рэспубліканскіх кнігасховішчаў, музеяў і архіваў здабыткамі беларускай дыяспары ў галіне навукі, літаратуры і мастацтва; вывучэнне культурнай спадчыны беларускай дыяспары, стварэнне банка інфармацыі пра беларускія выданні, мастацкія творы і іншыя матэрыялы, што знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

**Міністэрства культуры** непасрэдна прымала ўдзел у правядзенні першага з'езда беларусаў свету і арганізавала ў сябе прыём дэлегатаў з блізкага замежжа, першага з'езда беларусаў краін Балтыі, навукова-практычных канферэнцый "Культура беларускага замежжа", садзейнічала дзейнасці Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Было прафінансавана выданне двух зборнікаў "Культура беларускага замежжа" (1993 г.). Па рэкамендацыях таварыстваў беларускай культуры ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва прымаліся маладыя суайчыннікі з Польшчы. Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры сумесна з таварыствам "Радзіма" праводзіў курсы для кіраўнікоў самадзейных калектываў таварыстваў беларускай культуры. За 1994–1997 гг. на іх было накіравана 30 чалавек [8, арк. 14].

На працягу 1994 – 1997 гг. была аказана дапамога Таварыствам беларускай культуры ў Беластоку (Польшча), Маскве, Санкт-Пецярбургу, Калінінградзе, Набярэжных Чалнах (Расійская Федэрацыя), Львове, Кіеве, аўтаномнай рэспубліцы Крым (Украіна), Бішкеку (Таджыкістан), Рызе, Даўгаўпілсе (Латвія), Радзе беларускіх аб'яднанняў ў Таліне (Эстонія), Вільнюсе (Літва), абшчыне "Беларусь" ў Кішынёве (Малдова), Цэнтру беларускай культуры ў Шальчынінкаі (Літва), беларускай абшчыне Науляя (Літва) [8, арк. 16–19].

У 1994 г. з мэтай каардынацыі дзейнасці як нацыянальна-культурных аб'яднанняў у Беларусі, так і нацыянальна-культурных аб'яднанняў суайчыннікаў за мяжою, аказання ім арганізацыйна-метадычнай дапамогі быў створаны **Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур**. Праз Цэнтр накіроўваліся беларускія калектывы мастацкай творчасці ў краіны пражывання нашых суайчыннікаў, а пры правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь культурных мерапрыемстваў запрашаліся творчыя калектывы беларусаў замежжа.

Пэўную працу з дыяспарай праводзіў створаны ў 1991 г. **Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны (ННАЦ імя Ф. Скарыны).** Ён знаходзіўся ў адным будынку з ЗБС "Бацькаўшчына", што спрыяла правядзенню сумесных мерапрыемстваў. Дырэктар ННАЦ імя Ф. Скарыны доктар філалагічных навук, прафесар А. Мальдзіс быў асноўным рухавіком пашырэння навуковых кантактаў з дыяспарай і пашырэння ведаў аб ёй ў Беларусі. У 1993 г. у Цэнтры была заснавана бібліятэка з калекцыяй выданняў беларускай дыяспары. Яна мела рукапісны аддзел, тэматычную картатэку, збор фатаграфічных матэрыялаў. Вялікім дасягненнем стала стварэнне ў тым жа годзе музейнай экспазіцыі "Беларусы ў свеце", якая налічвала каля 600 экспанатаў. Пры ННАЦ дзейнічала Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (МАБ, створана ў 1991 г.), вялася база даных па беларусістыцы і пра беларусістаў свету. З 1996 г. МАБ выдавала штомесячны інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь "Кантакты і дыялогі". Асацыяцыя сумесна з ННАЦ імя Ф. Скарыны праводзілі міжнародныя канферэнцыі, асноўнай тэматыкай якіх былі культурныя сувязі Беларусі, асвятленне ўкладу выхадцаў з беларускіх зямель у сусветную культуру і навуку.

Далейшыя палітычныя падзеі ў краіне ўнеслі свае карэктывы ў адносіны дзяржавы з дыяспарай, падзялілі нашых суайчыннікаў. У заяве удзельнікаў **Другога з'езда** беларусаў свету, які адбыўся ў ліпені 1997 г. у Мінску, адзначалася: "Краіна перажывае сістэмны крызіс, які ахапіў усе бакі грамадскага жыцця. Своеасабліваю вехай у яго развіцці стаў лістападаўскі рэферэндум 1996 г., які раскалоў беларускую нацыю… Працэсы раз'яднання закранулі і дыяспару" [9].

Ва ўмовах падзелу беларускай дыяспары па палітычных поглядах дзяржаўнымі органамі Беларусі рабіліся спробы "перацягнуць" на свой бок беларускія суполкі замежжа. 28 ліпеня 1997 г. з 80 дэлегатамі Другога з'езда беларусаў свету, а таксама кіраўніцтвам ЗБС "Бацькаўшчына" сустрэўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

Важную ролю ва ўзаемадзеянні з дыяспарай пачалі адыгрываць дыпламатычныя прадстаўніцтвы. Напрыклад, у Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі пачаў працаваць аддзел па гуманітарнай рабоце і сувязях з суайчыннікамі. У 1999 г. пры актыўным удзеле Пасольства Беларусі ў Маскве была створана Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія "Беларусы Расіі" [10], зроблена спроба стварыць альтэрнатыўную ЗБС "Бацькаўшчына" грамадскую арганізацыю – Міжнародную асацыяцыю "Святло Радзімы" [11].

Найважнейшым крокам у рэалізацыі палітыкі ў адносінах да суайчыннікаў на гэтым этапе стала стварэнне ў 1997 г. **Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь** (у 2002 г. пераўтвораны ў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, з 2006 г. – Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей).

Значная ўвага надавалася беларусам Польшчы. У перыяд 1997–2000 гг. дзейнічала асобная Праграма падтрымкі нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў Польшчы. У сакавіку 1998 г. Гродзенскі аблвыканкам зацвердзіў праграму культурнай дапамогі беларусам Беластоцкага ваяводства Рэспублікі Польшча на 1998–2000 гг. [12]. Але падтрымка была вельмі абмежаванай. З больш чым палутара дзясяткаў грамадскіх арганізацый беларусаў Польшчы пастаянную дапамогу атрымлівалі толькі Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ) у Беластоку і Музей і асяродак беларускай культуры ў г. Гайнаўцы.

На жаль, не ва ўсе гады справа па падтрымцы беларусаў замежжа ішла добра. У 1999 г. Міністэрства фінансаў не выдзеліла сродкаў на гэтыя мэты, хаця планавалася, што Міністэрства культуры іх атрымае амаль на 80 % больш, чым у папярэднім годзе [13, арк. 256].

У пачатку XXI ст. на агульнадзяржаўным узроўні не было прынята ніякіх праграмных дакументаў, накіраваных на ўмацаванне сувязей з суайчыннікамі за мяжой. У той жа час Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў была зацверджана Праграма падтрымкі нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў у Рэспубліцы Польшча на 2002–2005 гг. [14].

На **трэці** з’езд беларусаў свету, які адбыўся ў ліпені 2001 г., прыехалі толькі 2/3 вылучаных дэлегатаў. Прычынай сталі настойлівыя парады беларускіх пасольстваў у краінах былога СССР і рэкамендацыі Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей не ехаць на з’езд. На з’ездзе былі прадстаўнікі дзяржаўных структур – Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Дзяржкамітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Мінгарвыканкама, Міністэрства юстыцыі [15].

У 2001 г. пачалася інфармацыйная кампанія па прасоўванні Закона аб беларускай дыяспары. У 2002 г. была створана рабочая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых беларускіх ведамстваў, якія працуюць з дыяспарай. Аднак распрацоўка законапраекта была прыпынена.

У 2002 г. быў створаны ***Кансультацыйны савет*** *па справах суайчыннікаў за мяжой і нацыянальных меншасцей Беларусі* пры Камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. На яго пасяджэнні ў 2003 г. было прынята заключэнне аб неабходнасці ***змены прыярытэтаў*** у дачыненні да беларускай дыяспары, асноўным прынцыпам прызнана наладжванне ўзаемавыгадных партнёрскіх адносін у розных сферах супрацоўніцтва, у першую чаргу ў эканамічнай.

Развіваліся навуковыя даследаванні дыяспары. У 2000 г. выйшаў у свет энцыклапедычны даведнік “Хто ёсць хто сярод беларусаў свету: Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах”, які быў падрыхтаваны ННАЦ імя Ф. Скарыны і МАБ. У 2004 г. ЗБС “Бацькаўшчына” заснавала серыю “Бібліятэка Бацькаўшчыны”. Першай кнігай у ёй стаў зборнік “Месца выдання – Парыж”, у які ўвайшлі выбраныя старонкі часопіса “Моладзь”, што выдаваўся ў Парыжы ў 1948–1954 гг. Працягвалі папаўняцца архіў і бібліятэка эмігранцкіх выданняў. Але ў 2006 г. ЗБС “Бацькаўшчына” вымушана была пакінуць арандаваны будынак. Да гэтага, у 2004 г., як асобная юрыдычная асоба спыніў сваю дзейнасць ННАЦ імя Ф. Скарыны. У выніку, частка збораў эмігранцкіх выданняў і архіваў, якія захоўваліся ў абедзвюх арганізацыях, была перададзена ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

**На чацвёртым з’ездзе** беларусаў свету ў 2005 г. ад дзяржаўных структур прысутнічалі толькі прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі і Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей [16]. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 80 ад 07.02.2005 г. быў зменены парадак паступлення ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь беларусаў замежжа. Па прынятых Правілах, беларусы замежжа сталі паступаць у ВНУ і сярэднія спецыяльныя ўстановы на тых жа ўмовах, што і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, – на конкурснай аснове.

У тым жа годзе пачалася рэалізацыя спецыяльнай праграмы супрацоўніцтва з беларускай меншасцю ў Польшчы пад назвай «Беларусы ў Польшчы ў 2005–2010 гадах» [17]. Яе распрацоўшчыкам выступіла **Міністэрства замежных спраў** Беларусі пры ўдзеле міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі, эканомікі, гандлю, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Нацыянальнай акадэміі навук і інш.

У адпаведнасці з мерапрыемствамі па рэалізацыі праграмы Міністэрства культуры сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур аказвала пастаяннае садзейнічанне беларускім аб’яднанням у Польшчы. Штогод праводзілася каля 100 разнастайных культурных мерапрыемстваў: Агульнапольскі фестываль “Беларуская песня”, фестываль “Музычныя дыялогі над Бугам”, святы беларускай культуры, абрадавыя святы, навуковыя канферэнцыі, алімпіяды беларускай мовы, конкурсы “Роднае слова”, “Пазнай Беларусь” і іншыя. Традыцыйнымі сталі тыдні беларускага кіно, дні культуры, выступленні прафесійных і аматарскіх тэатраў і іншых творчых калектываў, майстар-класы, курсы і семінары-стажыроўкі для беларускіх самадзейных калектываў і іх кіраўнікоў з Польшчы [18, арк. 54].

У 2006 г. пачала дзейнічаць першая Праграма развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006–2010 гг. Адпаведна Праграме Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей і Міністэрства замежных спраў (МЗС) былі вызначаны асноўнымі выканаўцамі мерапрыемстваў па стварэнні міжнародных і рэгіянальных саюзаў арганізацый суайчыннікаў. Праграма прадугледжвала дзесяць пазіцый мерапрыемстваў у напрамку культурнага супрацоўніцтва. Падобны дакумент быў прыняты Гродзенскім абласным саветам дэпутатаў на перыяд 2008–2010 гг.

У 2007 г. пачалася рэалізацыя буйнога праекта "Адміністрацыйны рэгіён Беларусі – арганізацыя суайчыннікаў за мяжою". Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей быў арганізаваны конкурс на лепшае супрацоўніцтва адміністрацыйных рэгіёнаў Беларусі са структурамі дыяспары за мяжою [19].

Пасля адмены санкцый у канцы 2008 г. змянілася і стаўленне ўлад да дыяспары, актывізавалася супрацоўніцтва. Напрыклад, традыцыйныя штогадовыя Дні культуры Беларусі ў Літве, якія праводзіліся грамадскімі аб'яднаннямі беларусаў Літвы пры падтрымцы Пасольства нашай краіны ў 2008 г., было вырашана правесці на дзяржаўным узроўні [20].

Важным крокам стала адкрыццё ў 2008 г. Культурнага цэнтра пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча. Ён пачаў функцыянаваць у рамках дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў Польшчы" ў г. Беласток.

На **пятым** з'ездзе беларусаў свету ў ліпені 2009 г. перад прысутнымі выступіў міністр культуры Беларусі Павел Латушка і Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Уладзімір Гуляка. Другі дзень з'езда пачаўся з сустрэчы дэлегатаў з міністрамі, прадстаўнікамі міністэрстваў і іншых дзяржаўных устаноў [21]. Знакавай падзеяй у развіцці супрацоўніцтва беларускай дзяржавы з суайчыннікамі за мяжой стала стварэнне пры Міністэрстве культуры *Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа*. Першае пасяджэнне савета адбылося ў чэрвені 2010 г. У ім прынялі ўдзел кіраўнікі беларускіх аб'яднанняў з Расіі, Малдовы, Украіны, Польшчы, Латвіі, Літвы і Эстоніі, а таксама кіраўнікі ЗБС "Бацькаўшчына" і Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма» [22, с. 104].

У тым жа годзе Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь быў распрацаваны "План мерапрыемстваў па развіццю стратэгічнага партнёрства з беларускай дыяспарай на 2010 г." Акрамя таго, Міністэрства культуры актыўна ўдзельнічала ў ажыццяўленні Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі ініцыятыў, прапанаваных удзельнікамі V з'езда беларусаў свету, а таксама штогадовага Плана дзейнасці Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы.

У 2010 г. Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (Таварыства "Радзіма") дапамагло беларускай дыяспары ў Аргенціне ўпершыню ў гісторыі беларускага руху ў Лацінскай Амерыцы стварыць самастойны Культурны цэнтр імя Кастуся Каліноўскага.

У снежні 2010 г. быў створаны Інстытут культуры Беларусі (Інбелкульт), у структуры якога прадугледжваўся аддзел па пытаннях беларускай дыяспары [22, с. 103]. У наступныя гады Інбелкульт да сваёй рэарганізацыі шляхам далучэння да БДУКМ у 2017 г. праводзіў тыднёвыя стажыроўкі для кіраўнікоў таварыстваў беларускай культуры. Напрыклад, у снежні 2014 г. быў арганізаваны майстар-клас па беларускаму народнаму мастацтву для 14 кіраўнікоў творчых калектываў беларускіх грамадскіх аб'яднанняў замежжа [23, с. 237].

Сярод супрацоўнікаў аддзела па пытаннях беларускай дыяспары Інбелкульта быў доктар філалагічных навук, прафесар Адам Мальдзіс. Дзякуючы яго намаганням, аддзел стварыў выставу "Беларусы ў свеце", якая дзейнічала з чэрвеня 2013 г., арганізаваў выставу твораў мастакоў аб'яднання "Маю гонар" (Латвія) на чале са старшынёй гэтага аб'яднання Вячкам Целашам. Аддзел працягнуў традыцыі, закладзеныя ННАЦ імя Ф. Скарыны, па зборы прадметаў, кніг, фотаздымкаў, дакументаў, карцін, навуковых прац нашых суайчыннікаў і даследчыкаў у замежжы [24, с. 153].

Пасля перапынку была адноўлена праца над праектам закона аб беларускай дыяспары. У 2008 г. Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей прадставіў канцэпцыю закона, якая атрымала адабрэнне вышэйшага кіраўніцтва краіны. Канчатковы варыянт законапраекта было даручана распрацаваць Міністэрству замежных спраў з улікам прапаноў, уне-

сеных прадстаўнікамі дыяспары на V з’ездзе беларусаў свету [25]. Але да прыняцця справа не дайшла.

7–10 ліпеня 2011 г. з мэтай прэзентацыі і папулярызацыі дзейнасці беларусаў замежжа, іх творчых здабыткаў адбыўся *Першы фестываль мастацтваў беларусаў свету*. У ім прымалі ўдзел амаль 250 суайчыннікаў з 12 краін. Частка мерапрыемстваў прайшла ў рамках XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянкі базар у г. Віцебску” [26].

Значная ўвага беларускай дыяспары была нададзена ў час правядзення ў Літве ў верасні 2011 г. Дзён культуры Беларусі, якія прайшлі пры арганізацыйнай і фінансавай падтрымцы як Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, так і Аб’яднання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы. У рамках двухдзённага візіту ў Вільню Павел Латушка як старшыня Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа сустрэўся з прадстаўнікамі беларускай нацыянальнай меншасці ў Літве, кіраўніцтвам Аб’яднання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы. Беларускаму калектыву «Світанак» з Вільнюса былі перададзены 12 камплектаў нацыянальных беларускіх касцюмаў, якія былі пашыты па дагавору з Міністэрствам культуры Беларусі [27].

З 2012 г. Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур выступаў асноўным арганізатарам *конкурсу сярод грамадскіх арганізацый беларускіх суайчыннікаў за мяжою на лепшыя дасягненні ў арганізацыі і рэалізацыі праектаў па пулярызацыі беларускай культуры ў краінах пражывання беларускай дыяспары (конкурс “Культура”).* Ён праводзіўся штогод з мэтай вывучэння грамадска-культурнай актыўнасці грамадскіх аб’яднанняў беларусаў за мяжою. На самы першы конкурс паступіла 26 заявак з 12 краін [28].

У ліпені 2013 г. адбыўся **шосты з’езд** беларусаў свету. На яго было вылучана 330 дэлегатаў з 22 краін, але прысутнічала 239 делагатаў і 95 гасцей з 18 краін замежжа і Беларусі. Вялікім было прадстаўніцтва дзяржаўных устаноў: міністр культуры, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў, Міністэрства культуры, апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Міністэрства эканомікі, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь [29].

У прынятым звароце былі адзначаны канкрэтныя недахопы ў дзяржаўнай палітыцы адносна беларускай дыяспары. Асноўныя з іх тычыліся ўдасканалення заканадаўчых і нарматыўна-прававых асноў для ўзаемадзеяння са шматмільённай беларускай дыяспарай. Дэлегаты заклікалі прыняць Закон “Аб беларусах замежжа”, распрацаваць і заканадаўча замацаваць статус “беларус замежжа”; прыняць дзяржаўную праграму “Беларусы ў свеце”; стварыць ва Урадзе Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны камітэт па справах беларусаў замежжа а ў парламенце – Камісію па справах беларусаў замежжа; у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – навуковы цэнтр па вывучэнні беларускай дыяспары [29].

Некаторыя з гэтых прапаноў былі рэалізаваны ў наступныя гады. Праз 14 гадоў пасля спынення дзейнасці праграмы “Беларусы ў свеце” была прынятая **новая праграма** з той жа назвай, разлічаная **на 2013–2015 гг**. [30]. Яна вызначыла задачы ў такіх напрамках, як удасканаленне арганізацыйных механізмаў супрацоўніцтва, інфармацыйны абмен, пашырэнне эканамічных кантактаў, узаемадзеянне ў сацыяльна-культурнай сферы, садзейнічанне захаванню беларускай дыяспарай нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і беларускай мовы. На перыяд 2016–2020 г. у дзяржаўную праграму “Культура Беларусі” ўвайшла падпраграма “Беларусы ў свеце”.

У рамках выканання праграмы толькі за 2014 г. для беларусаў замежжа былі пашыты і перададзены 63 камплекты нацыянальных касцюмаў, 10 камплектаў кніг і вучэбных дапаможнікаў, 3 камплекты мастацкай літаратуры [23, с. 237].

У чэрвені 2014 г. пры падтрымцы ЗБС «Бацькаўшчына» пры Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва паўстала навукова-творчая ініцыятыва «Цэнтр камплектавання і вывучэння дакументальнай спадчыны беларускага замежжа». Гэта архіўная кансультацыйная і даследчая структура прызначана садзейнічаць выяўленню, захаванню, апісанню, вывучэнню і папулярызацыі дакументальнай спадчыны беларускага замежжа [31].

У 2015–2017 гг. захавалася практыка накіравання за мяжу беларускіх нацыянальных касцюмаў, музычных інструментаў, кніг і падручнікаў на беларускай мове, арганізацыя пазнавальных

паездак беларускай моладзі ў Беларусь, удзел вучняў гімназіі імя Францыска Скарыны г. Вільнюса ў заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура", правядзенне майстар-класаў для кіраўнікоў творчых калектываў беларускай дыяспары і іншыя мерапрыемствы. За 2016 г. значна актывізавалася ўзаемадзеянне арганізацый беларусаў замежжа з беларускімі замежнымі ўстановамі. Так, у большасці краін, дзе знаходзяцца вялікія беларускія суполкі, практыкавалася сумеснае правядзенне мерапрыемстваў культурнай накіраванасці, прымеркаваных да памятных дат у гісторыі Беларусі, прыцягненне фальклорных калектываў дыяспары да ўдзелу ў правядзенні Дзён культуры Беларусі ў замежных краінах, а таксама ва ўрачыстых мерапрыемствах, якія праводзяць нашы пасольствы. Паступова ўводзілася практыка арганізацыі сустрэч беларускіх дэлегацый, якія наведвалі замежныя краіны, з прадстаўнікамі мясцовых суполак беларусаў. Працягнута работа па ўшанаванні выдатных беларускіх гістарычных асоб праз усталяванне ў замежных краінах помнікаў і памятных дошак [32].

Цікавым прыкладам плённага ўзаемадзеяння па захаванні беларусамі замежжа беларускай культуры і мовы ва ўмовах далёкага замежжа з'явілася адкрыццё ў жніўні 2016 г. класа беларускай мовы і літаратуры ў школе амерыканскага горада Сакрамэнта [32].

Важным крокам стала прыняцце 16 чэрвеня 2014 г. Закона Рэспублікі Беларусь "Аб беларусах замежжа", які вызначыў прынцыпы (арт. 16), мэты і напрамкі (арт. 17) дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа. У адпаведнасці з Законам функцыі *Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа* перайшлі да кампетэнцыі **Міністэрства замежных спраў**. Закон (арт. 15) таксама заклаў магчымасць стварэння пры рэспубліканскіх органах дзяржаўнага кіравання, абласных і Мінскім гарадскім выканаўчых камітэтах кансультацыйных органаў – саветаў (камісій) па справах беларусаў замежжа.

У ліпені 2015 г. адбылося першае пасяджэнне Савета ўжо ў МЗС Рэспублікі Беларусь. Яго пасяджэнні ў далейшым праходзілі штогод.

Пытанні супрацоўніцтва з дыяспарай упершыню ўвайшлі ў заканадаўства аб культуры. Так, у Кодэксе аб культуры (2016 г.) з шасці задач міжнароднага супрацоўніцтва (арт. 26) дзве тычацца дыяспары. Гэта "ўмацаванне і развіццё культурных сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і беларусамі замежжа;" і "захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа". Асобны артыкул Кодэкса (арт. 31) цалкам тычыўся падтрымкі беларусаў замежжа ў сферы культуры.

У канцы 2017 г. у Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь была створана рабочая група па справах беларусаў замежжа. Яе ўзначаліў старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Ігар Марзалюк. Па яго словах, важнейшай задачай групы з'яўляецца наладжване пазітыўных і канструктыўных адносін з беларускай дыяспарай. Дэпутат выказаў жаданне, каб дыяспара працавала на карысць беларускай дзяржавы [33].

Пэўную работу па падтрымцы і развіцці культурных, духоўных сувязей з беларусамі свету праводзіла таварыства "Радзіма". Так, у 2014 г. яго наведала каля 100 суайчыннікаў і замежных грамадзян, як у складзе дэлегацый, так і самастойна [34, арк. 6]. У 2015 г. гэта лічба зменшылася да 50 чалавек [35, арк. 7]. У 2016 г. Таварыства арганізоўвала візіты ў Беларусь прадстаўнікоў актыву і кіраўніцтва беларускіх арганізацый. Асобная ўвага надавалася прадстаўнікам маладога пакалення этнічных беларусаў і навучэнцам замежных школ і ВНУ, якія вывучаюць беларускую мову, літаратуру, культуру, традыцыі і гісторыю. Акрамя гэтага, быў арганізаваны візіт суайчынніцы Зяноны Сабчук, яе дачкі і ўнучкі (Аргенціна) у Беларусь, а таксама на яе этнічную радзіму ў г. Баранавічы, правядзенне прэзентацыі яе кнігі «Мае карані» [36, арк. 10].

У мэтах захавання і далейшага распаўсюджвання беларускай культуры за мяжой Таварыства рэалізоўвала праект «*Дакраніся да сваіх каранёў*». Для павышэння кваліфікацыі, азнаямлення з методыкай распрацоўкі рэпертуару калектываў мастацкай самадзейнасці ў 2014 г. быў праведзены міжнародны семінар-стажыроўка для кіраўнікоў фальклорных калектываў арганізацый беларускай дыяспары. Удзел прынялі кіраўнікі мастацкіх калектываў з Расіі, Літвы, Эстоніі, Італіі, Польшчы, Латвіі, Казахстана [34, арк. 9]. У 2016 г. з улікам пажаданняў нашых землякоў былі праведзены курсы павышэння кваліфікацыі для кіраўнікоў мастацкіх калектываў арганізацый беларускай дыяспары [36, арк. 10].

Праз Таварыства здзяйснялася матэрыяльна-тэхнічная падтрымка арганізацый суайчыннікаў за мяжою. Так, у 2014 г. беларускім арганізацыям у Эстонію, Літву, Латвію, Польшчу, Італію, Казахстан, Малдову была перададзена метадычная літаратура і падручнікі на беларускай мове агульнай колькасцю 952 экземпляры для бібліятэк, школ і класаў. У тым жа годзе былі перададзены сцэнічныя касцюмы для калектываў «Цаглінкі» і «Нараўчанкі» (Польшча), вырабленыя ў Навукова-вытворчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца» [34, арк. 10].

У 2016 г. актывізавалася праца Таварстыва "Радзіма" з журналістамі друкаваных выданняў арганізацый беларускай дыяспары, мэтай якога было пашырэнне інфармацыйнай прысутнасці Рэспублікі Беларусь за мяжой, устанаўленне партнёрскіх адносін паміж выданнямі, рэалізацыя сумесных праектаў [36, арк. 11].

У ліпені 2017 г. адбыўся **сёмы з'езд** беларусаў замежжа. На ім была прынята рэзалюцыя, якая заклікала распрацаваць дзяржаўную стратэгію "Беларусь–дыяспара" на перыяд да 2025 г. У сваім выступленні на з'ездзе міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей, звяртаючыся да суайчыннікаў замежжа, адзначаў: "Мы шчыра зацікаўлены ў тым, каб паслядоўна нарошчваць ваш удзел у сацыяльным, эканамічным, духоўным, культурным развіцці Беларусі, у захаванні, памнажэнні і ўзбагачэнні яе традыцый. … Калі ўзяць, напрыклад, культуру, мы павінны развіваць нашу мову, мы павінны развіваць нашы традыцыі, мы павінны звярнуць большую ўвагу на вяртанне культурных каштоўнасцей, якія былі страчаны ў розны час" [37].

**Заключэнне.** Такім чынам, у разгледжаны перыяд пытанні падтрымкі і развіцця сувязей з суайчыннікамі за мяжой займалі асобнае месца ў культурнай палітыцы Беларусі. Пачынаючы з першых гадоў незалежнасці, у краіне стала складвацца сістэма ўзаемадзення метраполіі з дыяспарай. У гэтым працэсе можна выдзеліць некалькі этапаў. У 1990–1995 гг. значна актывізаваліся сувязі, павялічылася колькасць суб'ектаў, якія займаліся іх наладжваннем і рэалізацыяй. Адбыўся першы з'езд беларусаў свету. Для сістэмнай працы быў створаны Каардынацыйны савет па справах беларускай дыяспары, распрацавана і прынята праграма "Беларусы ў свеце". Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах" было прадугледжана садзейнічанне нацыянальна-культурнаму развіццю беларускай дыяспары. Адказным за метадычную і практычную дапамогу таварыствам беларускай культуры за мяжой у іх культурна-асветніцкай дзейнасці было прызначана Міністэрства замежных спраў.

У 1996–2007 гг. на развіццё кантактаў з дыяспарай зрабілі істотны ўплыў палітычныя падзеі ў Беларусі і недастатковасць фінансавых сродкаў. Ва ўмовах падзелу беларускай дыяспары па палітычных поглядах важную ролю пачалі адыгрываць дыпламатычныя прадстаўніцтвы. Пытанні супрацоўніцтва з дыяспарай увайшлі ў кампетэнцыю створанага ў 1997 г. Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей. У 2002 г. пры ім пачаў дзейнічаць Кансультацыйны савет па справах суайчыннікаў за мяжой і нацыянальных меншасцей Беларусі. Пасля спынення рэалізацыі праграмы "Беларусы ў свеце" асобныя праграмы прымаліся толькі адносна падтрымкі беларусаў Польшчы. Некалькі гадоў вялася распрацоўка праекта закона аб беларускай дыспары. У 2003 г. было заяўлена аб змене прыярытэтаў у дычыненні да беларускай дыспары.

З 2008 г. назіраюцца істотныя перамены ў супрацоўніцтве беларускай дзяржавы з дыяспарай. Органы дзяржаўнай улады актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі ініцыятыў, прапанаваных удзельнікамі V з'езда беларусаў свету (2009 г.), але галоўным суб'ектам палітыкі адносна беларусаў замежжа з'яўлялася Міністэрства культуры. У 2010 г. пры міністэрстве быў створаны Кансультацыйны савет па справах беларусаў замежжа. У структуры Інстытута культуры Беларусі пачаў дзейнічаць аддзел па пытаннях беларускай дыяспары. Пасля перапынку была адноўлена праца над праектам закона аб беларускай дыяспары. Пачалі праводзіцца такія штогадовыя культурныя мерапрыемствы, як фестываль мастацтваў беларусаў свету і конкурс "Культура".

Новы этап пачаўся ў 2013 г. Ён адметны прыняццем Дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце" на 2013–2015 гг. і Закона "Аб беларусах замежжа". У адпаведнасці з Законам функцыі Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа перайшлі да кампетэнцыі Міністэрства замежных спраў. Пытанні супрацоўніцтва з дыяспарай увайшлі ў Кодэкс аб культуры. У канцы 2017 г. у Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь была створана рабочая група па справах беларусаў замежжа, больш разнастайным стала культурнае супрацоўніцтва з дыяспарай.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Сяргеева, Г. Дыяспара / Г. Сяргеева // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 3 : Гімназіі – Кадэнцыя. – С. 328–336.

2. Марціновіч, Д. Праходзіць першы з’езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] / Д. Марціновіч // 90’s. Мультымедыйны гістарычны праект, прысвечаны беларускім 90-м. – Рэжым доступу: http://90s.by/years/1993/belarusy-svetu.html. – Дата доступу: 08.08.2018.

3. Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 26 студз. 1990 г., № 3094-XI // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэсп. Беларусь. – 1990. – № 4. – Ст. 46.

4. Вопросы объединения белорусов мира «Бацькаўшчына» : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 2 апр. 1992 г., № 184 // Собр. постановлений Правительства Респ. Беларусь. – 1992. – № 10. – Ст. 167.

5. Сурмач, Г. І. Першы з’езд беларусаў свету / Г. І. Сурмач // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2001. – Т. 12 : Палікрат – Праметэй. – С. 316–317.

6. Культурныя сувязі Беларусі // Культурнае жыццё Беларусі: хроніка падзей. – 1994. – № 8. – С. 4.

7. Об одобрении Государственной программы «Белорусы в мире» и мерах по её выполнению : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 31 мая 1993 г., № 354 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. – 17 марта. – № 5/21753.

8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусі (НАРБ). – Ф. 974. Воп. 4. Спр. 194.

9. Заява ўдзельнікаў Другога з’езду беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/961/. – Дата доступу: 08.08.2018.

10. Гуманитарное сотрудничество [Электронный ресурс] // Посольство Республики Беларусь в Российской Федерации. – Режим доступа: http://embassybel.ru/belarus-russia-relations/associations/. – Дата доступа: 20.09.2018.

11. Гарэцкі, Р. Згуртаванню беларусаў свету “Бацькаўшчына” – 25 [Электронны рэсурс] / Р. Гарэцкі // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/zbsb/10112/. – Дата доступу: 02.02.2019.

12. Культурныя сувязі // Хроніка культур. жыцця. – 1998. – № 3. – С. 9.

13. НАРБ. – Ф. 974. Воп. 4. Спр. 288.

14. Об областной программе поддержки национально-культурного развития белорусов в Республике Польша : решение Гродн. обл. Совета депутатов, 24 апр. 2002 г., № 80 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 63. – 9/1942.

15. Трэці з’езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/962/. – Дата доступу: 08.08.2018.

16. Чацвёрты з’езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/963/. – Дата доступу: 08.08.2018.

17. Халадоўскі, М. Беларусы ў Польшчы 2005–2010 [Электронны рэсурс] / М. Халадоўскі // Ніва. – 2005. – 27 сак. – Рэжым доступу: http://niva.iig.pl/issue/2005/13/art_08.htm. – Дата доступу: 09.08.2018.

18. Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 2010 г. Справа 01-09. Даручэнні Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і дакументы па іх выкананню.

19. О реализации проекта «Административный регион Беларуси – организация соотечественников за рубежом» [Электронный ресурс] // Уполномоченный по делам религий и национальностей. – Режим доступа: https://belarus21.by/New/o-realizacii-proekta-administrativnyj-region-belarusi-organizaciya-sootechestvennikov-za-rubezhom. – Дата доступа: 08.08.2018.

20. Дні агульнасці і шматстайнасці // Культура. – 2008. – 18–24 кастр. – С. 2.

21. Пяты з’езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/964/. – Дата доступу: 08.08.2018.

22. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. – 144 с.

23. Лебедзь, Л. І. Нацыянальна-культурныя аб’яднанні ў Рэспубліцы Беларусь і грамадскія аб’яднанні беларусаў замежжа / Л. І. Лебедзь, М. Л. Рыбакоў // Беларуская культура – 2014: стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця : [зб. інфарм.-аналіт. матэрыялаў] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі ; уклад.: А. Р. Гуляева, І. Б. Лапцёнак ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 232–238.

24. Лемцюгова, І. В. Нацыянальна-культурныя аб’яднанні ў Рэспубліцы Беларусь і грамадскія аб’яднанні беларусаў замежжа / І. В. Лемцюгова, Л. І. Лебедзь // Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2013 / М-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Ін-т кульуры Беларусі ; уклад.: К. І. Рэмішэўскі, А. А. Галкін ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 148–155.

25. Прапановы ў праект Закона «Аб беларусах замежжа» [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: http://zbsb.org.sofia.neolocation.net/node/970. – Дата доступу: 20.09.2018.

26. Фестываль мастацтваў беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. – Рэжым доступу: http://bel.nationalcultures.by/arts-festival-of-the-belarusians/. – Дата доступу: 18.07.2018.

27. В Литве стартовали Дни культуры Беларуси [Электронный ресурс] // The Baltic Course. – Режим доступа: http://www.baltic-course.com/rus/novosti_baltiiskogo_regiona/?doc=7947&underline=минист. – Дата доступа: 13.07.2018.

28. Конкурс “Культура” [Электронны рэсурс] // Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. – Рэжым доступу: http://bel.nationalcultures.by/culture-contest/. – Дата доступу: 25.09.2018.

29. Шосты з’езд беларусаў свету [Электронны рэсурс] // Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. – Рэжым доступу: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/8254/. – Дата доступу: 26.09.2018.

30. Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай праграмы супрацоўніцтва з беларусамі замежжа «Беларусы ў свеце» на 2013–2015 гады : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 3 снеж. 2013 г., № 1035 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2013. – № 48. – 5/38108.

31. Запартыка, Г. Дакументы беларускага замежжа як сведкі гісторыі [Электронны рэсурс] / Г. Запартыка // Союз писателей Беларуси. – Режым доступа: http://old.oo-spb.by/ru/news/stati/1994.html. – Дата доступа: 17.09.2018.

32. Выступленне міністра замежных спраў Беларусі У. Макея на другім пасяджэнні Кансультацыйнага савета па справах беларусаў замежжа (5 верасня 2016 г., г. Мінск) [Электронны рэсурс] // Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусі. – Рэжым доступу: http://mfa.gov.by/be/press/statements/b932b883b9c68167.html. – Дата доступу: 18.07.2018.

33. Парламентская группа по делам белорусов зарубежья будет расширять экономические и культурные связи [Электронный ресурс] // БЕЛТА. – Режим доступа: http://www.belta.by/politics/view/parlamentskaja-grup-papo-delam-belorusov-zarubezhjja-budet-rasshirjat-ekonomicheskie-i-kulturnye-svjazi-281933-2017/. – Дата доступа: 01.10.2018.

34. Отчет о деятельности общественной организации “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма” в Министерство юстиции Республики Беларусь за 2014 год // Текущий архив ОО “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма”.

35. Отчет о деятельности общественной организации “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма” в Министерство юстиции Республики Беларусь за 2015 год // Текущий архив ОО “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма”.

36. Отчет о деятельности общественной организации “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма” в Министерство юстиции Республики Беларусь за 2016 год // Текущий архив ОО “Белорусское общество по связям с соотечественниками за границей “Радзіма”.

37. Выступленне міністра замежных спраў Беларусі У. Макея на 7-м з’ездзе беларусаў свету (15 ліпеня 2017 г., Мінск) [Электронны рэсурс] // Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://mfa.gov.by/be/press/statements/adbcc21275420548.html. – Дата доступу: 18.07.2018.

## References

1. Siarhiejeva H. Diaspora. *Encyklapiedyja historyi Bielarusi. T. 3.* [Encyclopedia of the history of Belarus. Vol. 3]. Minsk, 1996, pp. 328–336 (in Belarusian).

2. Marcinovič, D. *Passes the first congress of the Belarusians of the world.* Available at: http://90s.by/years/1993/belarusy-svetu.html (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

3. On languages in the Republic of Belarus: Law of the Republic of Belarus, January 26, 1990, no 3094-XI. *Viedamasci Viarchounaha savieta Respubliki Belarus̀* [Statements of the Supreme Soviet of the Republic of Belarus], 1998, no 24, art. 46 (in Belarusian).

4. Issues of the association of the Belarusians of the world “Baćkaŭščyna”: Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus, April 2, 1992, No. 184. *Sobranie postanovlenii Pravitel’stva Respubliki Belarus’* [Collection of the Decrees of the Government of the Republic of Belarus], 1992, no. 10, art. 167 (in Russian).

5. Surmač H. The first congress of the Belarusians of the world. *Bielaruskaja encyklapiedyja.* T. 12 [Belarusian encyclopedia. Vol. 12]. Minsk, 2001, pp. 316–317 (in Belarusian).

6. Cultural relations of Belarus. *Kulturnaje žyccio Bielarusi: chronika padziej* [The cultural life of Belarus: chronicle of events], 1994, no. 8, p. 4 (in Belarusian).

7. On the approval of the State Program “Belarusians in the World” and measures for its implementation: Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus, May 31, 1993, no. 354. *Natsional’nyi reestr pravovykh aktov Respubliki Belarus’* [National Register of Legal Acts of the Republic of Belarus], March 17, 2006, no. 5/21753 (in Russian).

8. *National Archive of the Republic of Belarus (NARB).* F. 974. L. 4. C. 194 (in Belarusian).

9. The Statement by the participants of the Second Congress of Belarusians of the World. *Zhurtavannie bielarusaŭ šviety “Baćkaŭščyna”* [Association of Belarusians of the World “Fatherland”]. Available at: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/961/ (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

10. Humanitarian cooperation. *Posol’stvo Respubliki Belarus’ v Rossiiskoi Federacii.* [The Embassy of the Republic of Belarus in the Russian Federation]. Available at: http://embassybel.ru/belarus-russia-relations/associations/ (accessed 20.09.2018) (in Russian).

11. Harecki R. The World Association of Belarusians “*Baćkaŭščyna*” celebrates its 25th anniversary. *Zhurtavannie bielarusaŭ šviety “Baćkaŭščyna”* [Association of Belarusians of the World “Fatherland”]. Available at: https://zbsb.org/news/zbsb/10112/ (accessed 02.02.2019) (in Belarusian).

12. Cultural relations. *Chronika kulturnaha žyccia* [Chronicle of the cultural life], 1998, no. 3, p. 9 (in Balarussian).

13. *NARB.* F. 974. L. 4. C. 288 (in Belarusian).

14. On the regional program to support the national-cultural development of Belarusians in the Republic of Poland: The decision of the Grodno Regional Council of Deputies, April 24, 2002, no. 80. *Natsional'nyi reestr pravovykh aktov Respubliki Belarus'*. [National Register of Legal Acts of the Republic of Belarus], 2002, no. 63, art. 9/1942 (in Russian).

15. Third Congress of Belarusians of the World. *Zhurtavannie bielarusaŭ śviety "Baćkaŭščyna"* [Association of Belarusians of the World "Fatherland"]. Available at: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/962/ (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

16. Fourth Congress of Belarusians of the World. *Zhurtavannie bielarusaŭ śviety "Baćkaŭščyna"* [Association of Belarusians of the World "Fatherland"]. Available at: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/963/ (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

17. Chaladoŭski, M. *Belarusians in Poland, 2005-2010*. Niva [*Cornfield*]. Available at: http://niva.iig.pl/issue/2005/13/art_08.htm (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

18. Archiŭ Ministerstva kultury Respubliki Bielarus za 2010 h. [*Archive of the Ministry of Culture of the Republic of Belarus for 2010*] Sprava 01-09. Daručenni Prezidenta, Nacyjanalnaha schodu, Administracyi Prezidenta, Savieta ministraŭ Respubliki Bielaruś, respublikanskich orhanaŭ dziaržaŭnaha kiravannia i dakumienty pa ich vykananniu. [*Dossier 01-09. Orders of the President, the National Assembly, the President's Administration, the Council of Ministers, national governments and the documents for their implementation*].

19. On the implementation of the project "Administrative Region of Belarus – the organization of compatriots abroad". *Upolnomochennyi po delam religii i natsional'nostei* [Commissioner for Religions and Nationalities]. Available at: http://www.belarus21.by/ru/main_menu/compatriots/opyt_raboty/new_url (accessed 08.08.2018) (in Russian).

20. Days of commonality and diversity. *Kultura* [Culture], 2008, October 18-24, p. 2 (in Belarusian).

21. Fifth Congress of Belarusians of the World. *Zhurtavannie bielarusaŭ śviety "Baćkaŭščyna"* [Association of Belarusians of the World "Fatherland"]. Available at: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/964/ (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

22. *Belarusian culture today, 2010: annual review*. Minsk, Belarussian State University of Culture and Arts, 2011. 144 p. (in Belarusian).

23. Liebiedź L. I., Rybakoŭ M. L. National-cultural associations in the Republic of Belarus and the Belarusian public associations abroad. *Bielaruskaja kultura – 2014: stan, tendencyi i pierspiektyvy razviccia: zbornik infarmacyjna-analityčnych materyjalaŭ* [Belarusian culture – 2014: condition, tendencies and prospects of development: collection information and analyzes]. Minsk, 2015, pp. 232–238 (in Belarusian).

24. Liemciuhova I. V., Liebiedź L. I. National-cultural associations in the Republic of Belarus and the Belarusian public associations abroad. *Bielaruskaja kultura sionnia: 2013: hadavy ahlad* [Belarusian culture today: 2013, annual review]. Minsk, 2014, pp. 148–155 (in Belarusian).

25. Offers in the draft law "On Belarusians abroad". *Zhurtavannie bielarusaŭ śviety "Baćkaŭščyna"* [Association of Belarusians of the World "Fatherland"]. Available at: http://zbsb.org.sofia.neolocation.net/node/970 (accessed 20.09.2018) (in Belarusian).

26. Belarusians of the World Festival of the Arts. *Respublikanski centr nacyjanalnych kultur* [Republican Center of National Cultures]. Available at: http://bel.nationalcultures.by/arts-festival-of-the-belarusians/ (accessed 18.07.2018) (in Belarusian).

27. Days of Culture of Belarus started in Lithuania. *The Baltic Course*. Available at: http://www.baltic-course.com/rus/novosti_baltiiskogo_regiona/?doc=7947&underline=минист (Accessed 13.07.2018) (in Russian).

28. Competition "Culture". *Respublikanski centr nacyjanalnych kultur* [Republican Center of National Cultures]. Available at: http://bel.nationalcultures.by/culture-contest/ (accessed 25.09.2018) (in Belarusian).

29. Sixth Congress of Belarusians of the World. *Zhurtavannie bielarusaŭ śviety "Baćkaŭščyna"* [Association of Belarusians of the World "Fatherland"]. Available at: https://zbsb.org/news/z-ezdy-belarusa-svetu/8254/ (accessed 08.08.2018) (in Belarusian).

30. On approval of the State program of cooperation with Belarusians abroad "Belarusians in the world" for 2013–2015: Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus, December 3, 2013, no. 1035. *Nacional'nyi reestr pravovykh aktov Respubliki Belarus'* [National Register of Legal Acts of the Republic of Belarus], 2013, no.48, 5/38108 (in Belarusian).

31. Zapartyka H. Documents of the Belarusian foreign countries how witnesses of history. *Soyuz pisatelei Belarusi* [Union of Writers of Belarus]. Available at: http://old.oo-spb.by/ru/news/stati/1994.html (accessed 17.09.2018) (in Belarusian).

32. Speech by Minister of Foreign Affairs of Belarus Vladimir Makei at the second meeting of the Advisory Council for Belarusians abroad (September 5, 2016, Minsk). *Ministerstva zamiežnych spraŭ Respubliki Bielaruś* [The Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Belarus]. Available at: http://mfa.gov.by/be/press/statements/b932b883b9c68167.html (accessed 18.07.2018) (in Belarusian).

33. Parliamentary group on the affairs of Belarusians abroad will expand economic and cultural contacts. *BELTA*. Available at: http://www.belta.by/politics/view/parlamentskaja-gruppa-po-delam-belorusov-zarubezhjja-budet-rasshirjat-ekonomicheskie-i-kulturnye-svjazi-281933-2017/ (accessed 01.10.2018) (in Russian).

34. Report on the activities of the public organization "Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad "Radzima" to the Ministry of Justice of the Republic of Belarus for 2014. C*urrent archive of the NGO "Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad "Radzima"* (in Russian).

35. Report on the activities of the public organization "Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad "Radzima" to the Ministry of Justice of the Republic of Belarus for 2015. C*urrent archive of the NGO "Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad "Radzima"* (in Russian).

36. Report on the activities of the public organization “Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad “Radzima” to the Ministry of Justice of the Republic of Belarus for 2016. C*urrent archive of the NGO “Belarusian Society for Relations with Compatriots Abroad “Radzima”* (in Russian).

37. Speech by Foreign Minister of Belarus Vladimir Makei at the 7th Congress of Belarusians of the World (July 15, 2017, Minsk). *Ministerstva zamiežnych spraŭ Respubliki Bielaruś* [The Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Belarus]. Available at: http://mfa.gov.by/be/press/statements/adbcc21275420548.html (accessed 18.07.2018) (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Кривошей Дмитрий Антонович** – кандидат исторических наук, доцент, старший научный сотрудник. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: kryvasheidz@gmail.com.

## Information about the author

**Dzmitry A. Kryvashei** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor, Senior Scientific Researcher. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: kryvasheidz@gmail.com